СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 8.18, 15.48, 7.30;
Віцебск — 8.15, 15.31, 7.16;
Магілёў — 8.07, 15.38, 7.31;
Гомель — 7.56, 15.43, 7.47;
Гродна — 8.32, 16.05, 7.33;
Брэст — 8.24, 16.14, 7.50.
МЕСЯЦ:
Поўня 10 снежня.
ІМЯНІНЫ:
Сцяпана, Хведара, Васіля, Рыгора;
Дамаза, Вальдэмара.

ЗВЯЗДА

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

11 СНЕЖНЯ 1992 г.
пятніца, № 245 (22023)

ВОЗГЛАС

У ДЭПАРТАМЕНЦЕ ЦЭН ПРЫ ДЗЯРЖЭКАНОМПЛАНЕ БЕЛАРУСІ

У сувязі з паступаючымі ад насельніцтва пытаннямі, Дэпартамент цэн пры Дзяржэканомплане паведамляе, што ў гэтым годзе

ПАВЫШЭННЯ ЦЭН

на харчовыя тавары, што рэалізуюцца па дзяржаўных фіксаваных рознічных цэнах, у тым ліку і на гарэлку белую,

НЕ ПРАДУГЛЕДЖВАЕЦЦА.

Чуткі пра гэта не маюць ніякіх падстаў.

АДПБ: СТОЙ, ХТО ПАЎЗЕ!

Савет Аб'яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі прыняў за аснову праект рэзалюцыі аб палітычнай сітуацыі ў рэспубліцы і задачах АДПБ, які будзе прапанаваны на зацвярджэнне чарговага з'езда партыі.

Паводле звестак БелаПАН, у праекце, у прыватнасці, гаворыцца: «У апошнія тры месяцы ўрад і парламент прынялі шэраг рашэнняў адкрыта антырынкавага характару... Па сутнасці, палітыка кіраўніцтва зарыентавана на стварэнне рынкавай эканомікі трэцяга свету, фарміраванне класа прадпрымальнікаў на аснове сімбіёзу ценявых структур і наменклатуры. Усё гэта гаворыць аб тым, што на Беларусі адбываецца паўзучы апаратны пераварот, адкат у правядзенні дэмакратычных рэформ.., сведчыць аб фарміраванні ў рэспубліцы аўтарытарнага рэжыму».

У заключэнне аб'яднаныя дэмакраты абяцаюць «змагацца законнымі сродкамі за датэрміновы роспуск Вярхоўнага Савета і правядзенне новых выбараў».

Алесь КНЯЗЮК.

БАНКІРЫ РАЗ'ЯЗДЖАЮЦЦА З НАДЗЕЯЙ

Узаемаразлікі паміж дзяржавамі Садружнасці стануць хутка такой жа прывычнай і бесклапотнай справай, як і разлікі паміж рэспублікамі былога Саюза. Гэты аптымістычны прагноз звязаны са стварэннем Міждзяржаўнага банка, праект пагаднення аб утварэнні якога падпісалі 9 снежня ў Мінску эксперты адзінаццаці рэспублік, прадстаўленыя намеснікамі кіраўнікоў нацыянальных банкаў, упаўнаважанымі ўрадаў, экспертамі міністэрстваў фінансаў.

Эпілогам работы нарады стала парафіраванне гэтых дакументаў на ўзроўні экспертаў, хоць па некаторых важных пытаннях поўнай аднадушнасці знайсці так і не ўдалося. Каверзным для ўдзельнікаў аказалася пытанне, што можна прыняць за адзіны міждзяржаўны разліковы сродак, калі ў многіх рэспубліках у абароце свае нацыянальныя грошы? Пасля доўгіх спрэчак эксперты сышліся на расійскім рублі. Хоць найбольш прывабным варыянтам паказалася прапанова аб увядзенні спецыяльнай міжнацыянальнай валюты, падобнай на адзінку Еўрапейскага эканамічнага супольніцтва — экю.

ЯКАСЦЬ ЯК ВЫНІК НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

Першая прыватная цырульня адкрылася ў Пружанах. У штаце 10 цырульнікаў і адна манікюрша. Праца — пазменная. Перабояў з хімпрэпаратамі няма. Няма і праблем з клієнтамі. Цэны — не вышэйшыя за дзяржаўныя. Хімічная завіўка каштуе каля 350 рублёў, мадэльная стрыжка — 80, стрыжка мужчынская — 40 рублёў.

Як гавораць самі цырульнікі, былыя часы на дзяржаўнай службе яны ўспамінаюць з пачуццямі, ад якіх становіцца не па сабе. Што значыць незалежнасць...

Рыгор ПАЛЯШУК.



Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь увёў у абарачэнне новыя разліковыя білеты вартасцю 200 і 500 рублёў.

Фота БЕЛІНФАРМ.

ДЫЯЛОГІ

Генадзь КАЗЛОЎ: «Палітычны дуэт — С. Шушкевіч і В. Кебіч — з'яўляецца для Беларусі гарантам стабільнасці ў цяперашніх умовах»

З каардынатарам парламенцкага аб'яднання «Беларусь» Генадзем Казловым гутарыць карэспандэнт агенцтва «Інтэрфакс» Вячаслаў Зяньковіч.

— Генадзь Іванавіч! У парадку дня цяперашняй сесіі Вярхоўнага Савета Беларусі значыцца пытанне аб адмене пастановы парламента ад 25 жніўня 1991 года «Аб часовым прыпыненні дзейнасці КПБ—КПСС на тэрыторыі РБ». Скажыце, якая наконт гэтага пазіцыя аб'яднання «Беларусь»?

— Гэтая праблема на пасяджэнні нашай дэпутацкай групы пры фарміраванні парадку дня цяперашняй сесіі не разглядалася і такая прапанова аднаго з дэпутатаў, мяркуючы па ўсім, з'яўляецца экспромтам. Калі вас цікавіць мая асабістая думка, то я — прыхільнік таго, каб на сесіі па гэтаму пытанню выступілі толькі тры чалавекі: пракурор рэспублікі, старшыня Вярхоўнага суда і міністр юстыцыі. Пасля таго як яны дадуць прававую ацэнку дзейнасці партыі ў час жнівеньскіх падзей 1991 года, парламент павінен прагаласаваць або за забарону дзейнасці КПБ, або за адмену пастановы ад 25 жніўня. Пры гэтым лічу дарэмнай тратай часу арганізацыю якіх-небудзь дыскусій. Усе мы і без таго ведаем думку фактычна кожнага па даному пытанню.

Я буду галасаваць за прававое рашэнне, паколькі знаёмы з афіцыяльным заключэннем пракурора Беларусі, у якім паведамляецца аб спыненні крымінальнай справы КПБ—КПСС адносна дачынення да ГКЧП СССР з фармулёўкай: «з прычыны адсутнасці саставу і падзеі злачынства».

— Вы лічыце, што парламент згодзіцца пакінуць будынак, у якім размяшчаўся Цэнтральны Камітэт Кампартыі?

— Не трэба наогул ставіць на сесіі пытанне аб вяртанні КПБ—КПСС маёмасці, што належала ёй. Думаю, што нам лепш пайсці прыкладна такім жа шляхам, які вызначыла для сябе Расія. Рашэнне Канстытуцыйнага суда РФ, па якім за правапераемнікамі КП Расійскай Федэрацыі замацоўваецца права прэтэндаваць праз суды на частку былой уласнасці партыі, лічу грамадзянным і разумным. Гэта дае магчымасць адкінуць усе эмоцыі і, строга прытрымліваючыся літары Закона, вызначыць: якая маёмасць нажыта за дзяржаўныя сродкі, якая — за членскія ўзносы і іншыя сродкі камуністаў. Вярхоўны Савет, прымаючы рашэнне аб Камуністычнай партыі Беларусі, абавязкова павінен, на маю думку, пацвердзіць сваё рашэнне аб перадачы партыйнай уласнасці дзяржаве. Гэта будзе правільна, хоць бы таму, што КПБ не з'яўлялася самастойнай партыяй, а функцыяніравала як філіял цяпер неіснуючай КПСС. Паколькі Савецкага Саюза сёння няма, КПСС, такім чынам, таксама не існуе.

Дарэчы, будучы дэлегатам апошняга з'езда КПБ, С. Шушкевіч падтрымаў ідэю рэгістрацыі партыі ў якасці самастойнай грамадскай арганізацыі. Наколькі памятаю па сродках масавай інфармацыі, толькі розніцай у адзін голас гэта рашэнне не прайшло.

— Многія назіральнікі адзначаюць, што ў выпадку ўвядзення ў рэспубліцы інстытута прэзідэнцкай улады асноўнымі кандыдатамі на пасаду кіраўніка дзяржавы стануць С. Шушкевіч і В. Кебіч. Як вы лічыце, ці зможа прэм'ер-міністр выкарыстаць адмену рашэння ад 25 жніўня ў палітычнай барацьбе са сваім саперніком на выбарах Прэзідэнта Беларусі?

(Заканчэнне на 3-й стар.).

ФАДЫЁ ФАКТ

Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі выступіла са зваротам да працоўных рэспублікі, усіх членаў прафсаюзаў. У ім гаворыцца, што, нягледзячы на патрабаванні прафсаюзаў стрымліваць рост цэн, больш настойліва выконваць эканамічную палітыку ў інтарэсах людзей, кіраўніцтва рэспублікі не прымае рашучых мер. Працягваецца наступленне на правы працоўных. Вярхоўны Савет прымае законы, якія абмяжоўваюць дзейнасць прафсаюзаў у абароне інтарэсаў людзей працы.

Прэзідыум савета Федэрацыі прафсаюзаў прыняў рашэнне правесці 22 снежня мітынг з удзелам прадстаўнікоў працоўных калектываў, прадпрыемстваў і арганізацый рэспублікі, дзе выставіць свае патрабаванні перад Вярхоўным Саветам і ўрадам. Калі яны будуць праігнараваны, Федэрацыя прафсаюзаў пакідае за сабой права аб'яўіць у рэспубліцы перадзабастовачнае становішча.

***

Разбазарванне аўтамабільнага транспарту ў арганізацыях Магілёўскай вобласці выявілі спецыялісты рэвізійнага ўпраўлення Міністэрства фінансаў рэспублікі. Толькі за мінулыя два гады «налева» рэалізавана 248 аўтамабіляў розных маркаў.

Сярод тых, хто здолеў па таннай цане набыць запаветныя «жыгулі», «масквічы», «нівы», — сем намеснікаў старшынь гар- і райвыканкомаў, 22 кіраўнікі пасялковых і сельскіх Саветаў і іх сваякі. Яны недаплацілі амаль 2 мільёны рублёў.

***

Створана першае беларуска-японскае прадпрыемства «Белафалкон». Адным з праектаў, якія маюць на мэце ажыццявіць бізнесмены, — абсталяванне беларускіх таксапаркаў японскімі аўтамабілямі па даступных цэнах. Фірма гарантуе таксама іх сервісное абслугоўванне.

***

Руская праваслаўная царква павінна адыграць пазітыўную ролю ў адраджэнні сілянства, лічыць Патрыярх Масковскі і Усяя Русі Аляксій Другі. Выступаючы перад журналістамі ў сваёй рэзідэнцыі ў Свята-Данілаўскім манастыры, кіраўнік Рускай праваслаўнай царквы напомніў, што здаўна на Русі цэнтрамі на сяле былі манастыры.

***

Улады латвійскага горада Вентспілса прынялі рашэнне прадаць з аўкцыёна пакінутую расійскую ваенную базу. Яе ўтрыманне абыходзіцца штомесяц у сто тысяч рублёў.

РЫНАК ЯК ЁН ЁСЦЬ

Гандаль—размова цывілізаваных людзей

Пакуль адны толькі дэкларуюць прынцыпы ўмацавання адзінай эканамічнай прасторы ў СНД, іншыя, у прыватнасці прадстаўнікі новай эканомікі, робяць гэта на справе. Не апошнюю ролю тут адыгрывае і дзейнасць міжнароднага ўніверсальнага Беларускага кірмашу «Усход—Захад—Поўнач—Поўдзень», чарговы «раўнд» якога завяршыўся ўчора ў Мінску.

Колькі ні кажы «халва» — саладзей у роце не стане. Гэтая ўсходняя сентэнцыя ўсё часцей узнікае ў свядомасці як своеасаблівая процівага ў нечым наўным чаканням, якія ёсць у кожнага з нас у адносінах да стабілізацыі становішча ўнутры СНД. Эканамічныя сувязі паміж краінамі па-ранейшаму ў многім разарваныя, пагадненні і дагаворы не выконваюцца, вытворчасць падае, а пакупаем у выніку мы з вамі — радавыя спажыўцы-чалавекі. Немалая ж частка палітыкаў, гаворачы з трыбун правільныя словы, на справе, відаць, ніяк не можа адмовіцца ад голага ў сваім прымітывізме, прынцыпу: свая кашуля бліжэй да цела.

Адным словам, час зрабіў нас скептыкамі. А таму — ці можна чакаць вялікіх змяненняў пасля чарговай, на гэты раз мінскай, сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў СНД? Спадзявацца, зразумела, можна і год, і два, але жыць, працаваць, харчавацца і апранацца (прабачце за банальнасць) трэба і сёння, і кожны дзень.

Усвядоміўшы знешнія абставіны, улічыўшы неспрыяльныя ўнутраную падатковую палітыку і эканамічнае заканадаўства наогул, трэба толькі здзіўляцца, што гандаль у межах СНД яшчэ жыве. І не толькі жыве сам, але і дапамагае выжыць нам, пакупнікам і спажыўцам.

...Цікавая, аднак, істота — звычайны наш пакупнік айчынны, «саўковай» фармацыі, які выхаваны на так званых выстаўках-продажах, дзе калісьці можна было набыць сёе-тое з дэфіцыту. Што мне з таго, разважае ён, што на гэтых кірмашах таўкуцца розныя там бізнесмены ды аб нечым дамаўляюцца? Іншыя, больш падкаваныя, песімістычна хітаюць галавой: маўляў, хоць яны і дамовяцца паміж сабой і пастаўляць адзін аднаму прадукцыю, дык усё роўна яе не аплоцяць, бо вядома, якое сёння бяспраддзе у разліках паміж краінамі

(Заканчэнне на 3-й стар.).

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб бязвыплатнай (з улікам жыллёвай квоты, сумы квот) перадачы ва ўласнасць жылля інвалідам з дзяцінства

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб прыватызацыі жыллёвага фонду ў Рэспубліцы Беларусь» Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Выканкомам мясцовых Саветаў народных дэпутатаў, прадпрыемствам, аб'яднанням і арганізацыям перадаваць ва ўласнасць бязвыплатна (з улікам жыллёвай квоты, сумы квот) кватэры, якія займаюць інваліды з дзяцінства ў межах 20 кв. метраў агульнай плошчы на кожнага члена сям'і. Плошча кватэр звыш указанай нормы выкупляецца на агульных падставах.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

3 снежня 1992 г.
г. Мінск.

У Дэпартаменце цэн пры Дзяржэканомплане

Аб абмежаванні цэн пры перапродажы спажывецкіх тавараў і прадукцыі вытворча-тэхнічнага назначэння

Як вядома, у мэтах спынення неабгрунтаванага завышэння цэн, якое з'яўляецца вынікам шматразовага перапродажу прадукцыі і тавараў, што вырабляюцца ў рэспубліцы, урад пастановай ад 25 лістапада 1992 г. «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнаму рэгуляванню і кантраляванню дзейнасці суб'ектаў гаспадарання» ўвёў 30-працэнтнае абмежаванне перавышэння свабодных аптовых і рознічных цэн над адпускнымі цэнамі прадпрыемстваў-вытворцаў.

Гэта азначае, што надбаўка да цэн, якая фарміруецца ў сферы абарачэння (аптовым і рознічным гандлі), не можа перавышаць па сукупнасці 30 працэнтаў да цаны вытворцы. Дзяленне агульнай надбаўкі ажыццяўляецца на пагадненню паміж бакамі-ўдзельнікамі.

Такі падыход да фарміравання цэн ва ўмовах строгага кантролю за імі з боку органаў цэнаўтварэння, падатковых службаў і адпаведных службаў МУС узмацняе адказнасць удзельнікаў гандлёвых здзелак за прадастаўленне партнёру праўдзівых звестак аб цане прадпрыемства-вытворцы і спаганяемых надбаўках.

Абмежаванне цэн уводзіцца з даты прыняцця пастановы Савета Міністраў, г. зн. з 25 лістапада бягучага года, адносна спажывецкіх тавараў і прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэння, выробленых у Беларусі і прадаваемых (перапрадаваемых) у рэспубліцы аптовымі і рознічнымі гандлёвымі прадпрыемствамі, іншымі прадпрыемствамі, якія ажыццяўляюць гандлёвыя аперацыі, незалежна ад падпарадкаванасці, форм уласнасці і гаспадарання.

Цэны на тавары (прадукцыю), вывозімыя з рэспублікі, фарміруюцца без якіх-небудзь абме-

(Заканчэнне на 3-й стар.).

Рублі супраць «зайчыкаў»

Нязначнае, здавалася б, словазлучэнне «а таксама іншыя» выклікала сапраўдны шквал розных дэпутацкіх ацэнак. Так адрэагавалі парламентарыі на адзін з пунктаў законапраекта «Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях». Разглядаўся ён у другім чытанні, і большасць артыкулаў пасля дапрацоўкі Камісіяй па пытаннях галоснасці, сродкаў масавай інфармацыі і правоў чалавека прымалася без асаблівых дыскусій. Упамянутая ж вышэй спрэчка разгарэлася пры абмеркаванні пункта, у якім запісана: «Фінансавыя і маёмасныя ахвяраванні, а таксама іншыя даходы рэлігійных арганізацый падаткамі не абкладваюцца». Што разумець пад словамі «а таксама іншыя даходы»? Каб выключыць двухсэнсаваць, адны дэпутаты прапанавалі зняць другую частку прапановы, другія — адразу ўвесь абзац.

Кіраўнік Беларускай праваслаўнай царквы прапанаваў сваю папраўку. Сутнасць яе ў тым, каб фінансавыя і маёмасныя ахвяраванні і іншыя даходы (маецца на ўвазе толькі канфесіянальная, духоўная дзейнасць) рэлігійных арганізацый падаткамі не абкладаліся.

Адказваючы на дэпутацкі запыт Аляксандра Лукашэнкі, на прыбуну падняўся старшыня Планавай і бюджэтна-фінансавай камісіі Раман Унучка. Па даручэнню Вярхоўнага Савета камісія вывучала сітуацыю, звязаную з увядзеннем Нацыянальным банкам Беларусі камісійнага збору за абмен рублёў на «зайчыкаў». Нагадаем, што цяпер для таго, каб абмяняць у Ашчадным банку да дзвюх тысяч рублёў, чалавек павінен заплаціць 30 працэнтаў, звыш дзвюх тысяч — 50 працэнтаў абменьваемай сумы. На думку Рамана Унучкі, камісія не знайшла дастатковых падстаў для прыпынення рашэння ўрада.

Цяпер 60 працэнтаў зарплаты выдаецца «зайчыкамі». Няцяжка здагадацца, што пры велізарных скачках цэн многім сем'ям прыйдзецца траціць на прадукты харчавання практычна ўсю зарплату. Што рабіць з гэтым? Раман Унучка сказаў, што пры жаданні грамадзяне Беларусі могуць абмяняць рублі на разліковыя білеты без камісійнага збору па месцы работы. Не паведаміў толькі, як будуць успрыняты гэтыя звароты людзей на месцах.

СМАЧНА ЕСЦІ!

Стравы з буракоў

Узімку, калі амаль уся гародніна ў большай ці меншай ступені губляе свае запасы вітамінаў і іншых карысных рэчываў, на дапамогу прыходзяць буракі. Адна з выдатных якасцей гэтага караняплода ў тым, што ён нават пры доўгім захоўванні не губляе смаку і карысных уласцівасцей.

Звычайна буракі вараць доўга — даве—тры гадзіны, але гатоўнасці іх можна дамагчыся хутчэй. Пры лёгкім кіпенні варыце буракі на працягу гадзіны, потым зліце гарачую ваду і пастаўце на 10 хвілін пад струмень халоднай вады.

Для салатаў або вінегрэтаў буракі вараць або пякуць з лупінамі,— зразумела, спачатку добра вымыўшы іх.

Салата з буракоў

Буйны бурак натрыце на дробнай тарцы, змяшайце з пацёртым на буйной тарцы яблыкам, вішнёвым сокам, пацёртай апельсінавай цэдрай і запраўце цукрам.

Буракі фаршыраваныя

Памыць і спячы караняплоды, абабраць лупіны. Дастаць сярэдзіну і запоўніць мясным фаршам з рысам. Пакласці на глыбокую патэльню з маслам і запякаць у духоўцы 20 хвілін. Потым дастаць, паліць зверху смятанай і яшчэ на некалькі хвілін паставіць у духоўку. Фаршыраваць бурак можна таксама яблыкамі або рысам з разынкамі.

На 10 невялікіх буракоў 250 г мяса, 1/2 шклянкі рысу, 2 сталовыя лыжкі масла, 200 г смятаны.

Бурачная ікра з цыбуляй і часнаком

Буракі зварыць, абабраць. Прапусціць праз мясарубку. Цыбулю абсмажыць, перамяшаць з буракамі і яшчэ раз усё прапусціць праз мясарубку. Злёгку падсмажыць тамат, выціснуць сок з лімона, дадаць соль і цукар, расцерці з соллю часнок і ўсё перамяшаць. Паставіць на агонь хвілін на 5—10; увесь час перамешваць.

На 500 г буракоў 2 вялікія цыбуліны, 2-3 сталовыя лыжкі алею, 2 сталовыя лыжкі тамату, 2-3 зубкі часнаку, сок 1/2 лімона, цукар і соль—па смаку.

Салата зімовая

Для прыгатавання трэба 2 кг буракоў, 1 кг перцу, 1 кг цыбулі, 400 г алею, соль па смаку (можна пасаліць пасля прыгатавання, можна не саліць).

Бурак (сыры) нацерці на буйной тарцы. Цыбулю, перац нарэзаць саломкай. Усё перамяшаць, дадаць алей. Тушыць 45 хвілін на слабым агні. Гарачым раскласці ў слоікі, закатаць.

Буракі, тушаныя ў смятане

Абабраныя і памытыя буракі, а таксама моркву, пятрушку нарэзаць саломкай, пакласці ў каструлю (не эмаліраваную), дадаць масла, воцат, крыху вады, перамяшаць і тушыць пад накрыўкай да гатоўнасці (45—60 хвілін), перамешваючы час ад часу, каб гародніна не падгарэла. Калі яна будзе гатовая, пакласці муку, добра перамяшаць, дадаць смятану, соль, цукар, лаўровы ліст, зноў добра перамяшаць і кіпяціць яшчэ 10 хвілін.

На 500 г буракоў 1 морква, 1 корань пятрушкі, 1 чайная лыжка воцату, 1 чайная лыжка цукру, шклянка смятаны, 1 сталовая лыжка мукі, 2 сталовыя лыжкі масла.

Гаспадарлівым мужчынам,

якія хочуць самастойна шыць, мыць, прасаваць

Вы лічыце, што толькі жаночыя рукі здольныя добра ўпраўляцца з хатнімі справамі! Калі вы сур'ёзна думаеце так, сцерагіцеся! Любая жыццёвая дробязь можа абярнуцца для вас, паважаныя мужчыны, бядой. Каб гэтага не здарылася, прывучайцеся рабіць што-небудзь самі. А мы з задавальненнем дапаможам вам набыць хаця б мінімум ведаў і навыкаў.

● **У адзеваных гузікаў** ёсць адна непрыемная ўласцівасць — губляцца. Так што лепш іх прышываць адразу. Самыя «хадавыя» гузікі — з чатырма адтулінамі. Возьміце падыходзячую па колеру нітку і іголку, завяжыце на канцы вузельчык — і пачынайце работу. Прышывайце гузік альбо крыж-накрыж, альбо дзвюма паралельнымі лініямі. Спосабы праверэння, там што не спрабуйце прыдумаць што-небудзь яшчэ.

● **Да тонкай тканіны** прышывайце гузікі шчыльна. Калі ж тканіна больш тоўстая — нітку не зацягвайце, а іголку ўколвайце бліжэй да цэнтра гузіка. Перш чым замацаваць нітку з левага боку, абкруціце яе некалькі разоў вакол ніцянога слупка гузіка — гэтак яна будзе мацней і больш надзейна трымацца.

ХІТРАСЦІ:

Падбірайце колер нітак пад колер тканіны. А калі раптам толькі што прышыты гузік трэба адрэзаць, зрабіце гэта асцярожна, пры магчымасці не прыхапіўшы кавалачак тканіны. Для гэтага трэба падняцці пад гузік грабеньчык, а потым рэзаць, трымаючы ножніцы або лязо паміж гузікам і грабеньчыкам.

● **Паміж тоўстай тканінай і гузікам трэба ладзіць невялікі прамежак. Гэтым вы захаваеце пятлю ад дэфармацый, ды і гузік праслужыць больш. Для большай зручнасці пакладзіце зверху на гузік даве запалкі і прышыйце яго разам з імі. Потым запалкі выньце, гузік адцягніце ад тканіны і туга замацуйце нітку. Цяпер гузік стаіць на трывалай ножцы.**

● **Калі адзенне парвалася,** дзірку можна на некаторы час заклеіць звычайным лейкапластырам з левага боку, каб тканіна не распаўзалася. А потым ужо заняцца рамонтам.

● **Цяпер — парада іншага роду.** Не накаплівайце брудную бялізну. Значна лягчэй вымыць яе адразу. Белую і каляровую аддзяліце. Насыпце пральнага парашку ў не вельмі гарачую ваду, апусціце ў яе бялізну. Каўнерыкі і абшлагі кашуль трыце старанна рукамі, а не шчоткай. Пры мыцці шкарпэтак — наскі і пяткі. Бялізну прапалашчыце ў чыстай вадзе і павесьце сушыцца. Кашулі — на плечыкі.

● **Калі бялізна высахла,** трэба яе адпрасаваць. Штаны вы абавязкова павінны навучыцца прасаваць самі. Пояс і верхнюю частку прасуйце праз вільготную, папярэдне выкручаную тонкую белую тканіну. Потым пакладзіце іх на ўсю даўжыню на прасавальную дошку і адагніце адну калашыну. Спачатку трэба прасаваць штаны на каленях, каб гэтыя месцы злёгку «ўцягнуліся». Цяпер укладзіце іх бакавымі швамі і старанна запрасуйце пярэднюю і заднюю складкі па ўсёй даўжыні. Тое ж самае зробіце і на другой калашыне. Складзіце абе калашыны разам і яшчэ раз адпрасуйце. У такіх штанах выгляд у вас будзе падцягнуты і элегантны.

Але ўлічыце, што складкі бываюць патрэбныя і непатрэбныя. Ад непатрэбных пазбаўляйцеся, акуратна вешаючы адзенне.

ХІТРАСЦІ:

Пачынаючы прасаваць, праверце, ці не забруджаны прас, ці не перагрэўся ён. Для гэтага дастатковае правесці ім па чыстай сухой анучцы.

Складка на штанах захаваецца надоўга, калі працерці яе з левага боку кавалачкам сухога мыла, а потым адпрасаваць праз вільготную анучку.

БЕЛАРУШЧЫНА

ЖЫВЫ ФАЛЬКЛОР

КАБ ДЗЯДЫ НЕ ВЕДАЛІ БЯДЫ, А ЎНУКІ НЕ ВЕДАЛІ МУКІ

Паўсюдна кіпіць злосць. Мы сталі нервовымі, неўтаймаванымі, незацуглянымі... Крута «прысоленыя» кпіны ляцяць у парламентарыяў і членаў урада, у гандляроў, транспартнікаў, міліцыянераў, у камуністаў і дэмакратаў. Такое можна пачуць у аўтобусе ці чарзе — закачаешся... А чаму б не перавесці ўсё ў гумар ці, дзеля разрадкі абстаноўкі, не прыгадаць хоць бы і бабчыны праклёны! Там, глядзіш, і да добрых пажаданняў недалёка. Паспрабуем!..

Праклёны і пажаданні — з'явы, па сутнасці, роднасныя, таму з малодшым навуковым супрацоўнікам інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі Уладзімірам СЫСОВЫМ дамовіліся весці гутарку адразу ў двух накірунках.

— Калі і ў сувязі з чым узніклі праклёны і пажаданні?

— Яны прыйшлі да нас з сівой даўніны — з таго часу, калі чалавек зрабіў спробу асэнсаваць, вытлумачыць рэчаіснасць. Зыходзячы з наіўных, перш-часных поглядаў і ўяўленняў, ён падзяліў свет на дзве паловы — добрую і дрэнную. Дрэнная частка, меркаваў наш продак, населена «нячыстымі», злымі духамі, якія ва ўсім імкнуцца нашкодзіць. А да добрых, зычлівых багоў ён звяртаўся па дапамогу.

— Зараз у нас з зычэннямі праблема, фантазія абмяжоўваецца звычайна банальна-трафарэтным «моцнага здароўя і шчасця ў асабістым жыцці». А якія пажаданні карысталіся папулярнасцю даўней?

— Перш за ўсё — звязаныя з сямейнай абраднасцю. На радзінах, вяселлях, провадах у войска, уваходзінах у новую хату і нават пры пахаванні выказвалася шмат пажаданняў. Людзі зычылі адзін аднаму дабрабыту ў хаце, двары і полі, здароўя, шчасця. Нярэдка з'яўлялася і павучальная ноткі — напрыклад, у зычэннях маладым пры дзяльбе караваю на вяселлі: каб з'явіліся дзеткі, каб жылі мірна, уступалі адзін аднаму. Старэйшыя звярталі ўвагу маладых, што менавіта з вяселля, з нараджэння новай сям'і закладваецца працяг роду. Сведчанкем таму могуць быць пажаданні, запісаныя ў час апошніх фальклорных экспедыцый у Віцебскім раёне: «Жадаю, каб было ў вас два з банцікам, два з кранцікам, а пяты — па ўсматрэнню», альбо: «Каб было ў вас — як у хаце: колькі сучкоў, столькі сынкоў, а колькі шчэлачак — столькі дзевачак».

На радзінах, калі баба дзяліла кашу, дзеткам зычылі быць здаровенькімі і дужымі, мець добры лёс. Яшчэ з язычніцкіх часоў ідзе традыцыя жадаць дзіцяці быць моцным, як зямля, добрым і патрэбным людзям — як вада ці паветра.

Другая частка пажаданняў звязана непасрэдна з каляндарнай абраднасцю. Надзвычай багатымі былі калядныя пажаданні калі валачобнікі з песнямі абыходзілі двары. Трапныя і дасціпныя пажаданні захаваліся на Гродзеншчыне. Калядоўшчыкі, падыходзячы да хаты гаспадара, зычылі:

Добры вечар, гаспадару!
Вынесь жа нам каўбас пару.
Вынесь сала, не скупіся —
Каб твой ячмень урадзіўся,
Каб нажалі сто ноп жыта,
Каб сям'я была ўся сыта,
Каб скацінка вадзілася,
Каб пшаніца радзілася,
Каб гарэлку выпівалі,
Калядніча ў частавалі!

Калі гаспадар быў сквапны і нічым не хацеў пачаставаць моладзь, якая прыходзіла да яго хаты, гучалі саркастычныя пажаданні: «Не даў ты нам, дзядзька, сала — каб да цябе хвароба прысталі», або: «Не даў ты нам гарнец аўса — каб ў цябе здохла аўца». Гэтыя зычэнні ўвогуле жартаўлівыя: маўляў, не трэба быць такім сквапным! А калі гаспадар і зусім праганяў калядоўшчыкаў са двара, дык яны, адбегшы, крычалі: «А не даў ты нам папець, каб ты не ўзлез і на печ!»

— Паколькі мы закранулі абразлівыя звароты, самы час, напэўна, перайсці да праклёнаў. Народ наш мяккі, спагадлівы, але жыццё вымушала і лаяцца...

— Аднак беларускія праклёны не такія ўжо і моцныя. Большасць з іх маюць гратэскавую, жартаўлівую форму. Нядаўна мне давялося чуць, як бабка праклінае мышак, што пагрызлі кут у хаце: «Ах, мышкі, як жа кут згрызлі — а каб вам зубкі папухлі».

Беларуская мова настолькі мілагучная, ласкавая, што паніжае экспрэсіўнасць зместу самых страшных праклёнаў. Яшчэ ў пачатку нашага стагоддзя даследчык М. Нікіфароўскі адзначаў: і ў галашэннях, пры вялікім горы беларус настолькі непаўторны ў сваёй мове, што нават дзеясловы **есці, піць** у яго пераходзяць у памяншальна-ласкальныя формы **естанькі, пітанькі.**

Благому чалавеку звычайна зычылі, каб ён знік з гэтага свету ці каб у яго самога здарылася няшчасце — і ён праз уласны боль адчуў боль іншага. Калі ў чалавека нешта ўкралі, можна пачуць: «А каб жа цябе выцягнулі на могілкі», альбо: «Змей праклятый, дух з цябе вон, пар стаўбом». Выказваецца надзея, што зло разам з чалавекам, які яго творыць, знікне са свету: «Каб табе Бог працягнуў века ўздоўж на лаўцы» (нябожчыка кладуць у кут пад абразамі на лаўцы). Балбатуну гавораць: «Ціпун табе на язык».

А калі хлопец доўга ходзіць да дзяўчыны сватацца, а потым жэніцца з іншай: «Сватаў, сватаў — каб цябе Бог са свету спратаў».

— Слухаючы пажаданні і праклёны, проста дзіву даешся — як працавала фантазія, як трапна, метафарычна, дасціпна ўмелі сказаць нашы продкі!

— І пажаданні, і праклёны — фальклорныя жанры, яны праходзілі народную апрацоўку, шліфоўку, перадаючыся з пакалення ў пакаленне, ад чалавека да чалавека. Адзначу, што мова фальклорных твораў і сёння працягвае актыўна апрацоўвацца ў народзе. Нават у межах адной вёскі адзін і той жа выраз заўсёды мае некалькі варыянтаў. А для трансляцыі з пакалення ў пакаленне людзі звычайна выбіралі аптымальны варыянт таго ці іншага выразу. Дарэчы, аматарам беларускага афарыстычнага мастацтва я раіў бы зазірнуць у кнігу «Выслоўі», складзеную М. Грынблатам (яна выйшла ў серыі «Беларуская народная творчасць»). Тут сабрана ўсё, што было запісана фалькларыстамі і этнографамі на працягу мінулага і гэтага стагоддзяў: пажаданні, прыгаворкі, жарты, каламбуры, тосты, вітанні ласкавасці, ганьбаванні і г. д.

— Уладзімір Мінавіч! Але адкуль у лагоднай, як вы кажаце, мове — мацюкі, брыдкаслоўе?

— Хутчэй за ўсё, яны прыйшлі да нас праз рускую мову. Як вядома, рускі народ доўгі час цярпеў пад ярмом манго-ла-татарскага іга. Прыніжэнне нацыянальнай годнасці рускіх, жорсткасць да іх нараджала ў адказ таксама жорсткасць ва ўсіх жыццёвых адносінах і тое прыдкаслоўе, якое да цяперашняга часу захавала руская мова. Так сталася, што і мы асіміліравалі гэты спецыфічны пласт лексікі. Але, падкрэслю, яна створана не намі. Пра чужароднасць мацюкоў у беларускай мове сведчыць іх фанетычная, граматычная і сінтаксічная будова.

— Ну, і на заканчэнне: што б вы пажадалі чытачам нашай газеты?

— Шчасця вам, долі, каб хлеба ўволю! Надзею майце, сяброў не губляйце! Будзьце здаровенькі і багаты, радасці й ветлівасці ў вашыя хаты!

***

На развітанне Уладзімір Мінавіч прапанаваў некалькі пажаданняў і праклёнаў, запісаных у час апошніх фальклорных экспедыцый.

ПРАКЛЁНЫ

* Замардуй, загадуй, закалаці вас трыста радзімцаў і з радзімчыкамі.
* Акалей твая галава.
* Каб табе белы свет зачыніўся.
* Каб на цябе тры пагібелі і адна трасца.
* Ідзі ты, бес, на сухі лес.
* Каб ты па вадзе хадзіў і піць прасіў.
* Каб твае дзеці на базары жменямі бульбу куплялі.
* Каб ты не рос, не старыўся, на нагах не ставіўся!
* Каб табе ручкі ў кручкі, ножкі ў качарожкі.
* Няхай маё дабро табе на пазвоннае будзе (злодзею).
* Каб ты не знаў свайго роду-племені.

ПАЖАДАННІ

* Будзь здароў, як дуб, а моцны, як зубі!
* Каб вам яшчэ многа гадкоў смачна спалася і лёгка ўставалася!
* Каб вам пілося, елася і яшчэ хацелася!
* Каб у вас было і на стале, і ў калысцы!
* Каб дзяды не ведалі бяды, а ўнукі не ведалі мукі!

Таццяна ПАДАЛЯК.

У ВАШУ ПАШТОВУЮ СКРЫНКУ

Якія ж Каляды без звязды?

25 снежня — першыя, як у нас кажуць, Каляды. Свята, якое калісьці засланяла сваёй абрадавай пышнасцю Новы год, падобна на тое, вяртаецца да нас. Менавіта Каляды былі і застануцца першым святам народнага календара. Бо ў гэтым свяце — і ранейшы, стражытны змест павароту прыроды ад зімовага сну да вясновага ўваскрашэння, і пазнейшы — усялюдскага выратавання з нараджэннем Хрыстовым...

Калі вы, не адкладваючы, зазірнеце ў кнігарні і кіёскі, вам яшчэ можа пашанцаваць на новых беларускія паштоўкі. Раім: павіншуйце дарагіх вам людзей найперш з Калядамі. Хоць бы вось гэтай паштоўкай мастака В. Валынца. Нам яна даспадобы яшчэ і таму, што на ёй ва ўсёй красе — калядная ЗВЯЗДА.

Праўда, ці ведаеце вы, што паштоўкі без марак цяпер каштуюць пяць рублёў! Калі для вас гэта задорага, ці калі вы не знойдзеце такі арыгінал — смела бярыце ў рукі нажніцы, няхай гэта будзе сціплае газетнае віншаванне і ад нас.

З КНІГАРНІ

Гарады—як людзі

Седзячы ў Мінску, чытаю пра свой родны Слуцк і адкрываю для сябе шмат нечаканага. Аказваецца, слуцкія паясы некалі выцяснілі турэцкія і персідскія і заваявалі еўрапейскі рынак яшчэ і дзякуючы вядомаму майстру Яну Маджарскаму (Аванесу Маджаранцу), які пераехаў у Беларусь са Стамбула ў 1757 годзе. Радзівілы паспрыялі, каб услед прыбылі спецыяльны каток для пранатавання паясоў і дэталі асобнага ткацкага станка. Па іх узору княжацкія механікі сабралі яшчэ некалькі станкоў. Але акрамя Яна-Аванеса іншаземцаў на мануфактуры не было. Працавалі ў асноўным жыхары Слуцка і Нясвіжа, сяляне з навакольных вёсак. Гэта іх цудоўнае майстэрства ўвекавечыў Багдановіч.

А ўскальзкула маю ўдзячную памяць пра родны край кніжка «Нашы гарады», якую напісалі Уладзімір Малішэўскі і Пятро Пабока. Трапіла яна мне ў рукі выпадкова: тыраж занадта цішлы, усяго 10 тысяч экземпляраў. А расказваецца тут пра ўсе гарады Беларусі, кожны з якіх мае сваю цікавую гісторыю. Гарады — як людзі, кожны са сваім абліччам.

Нямала карыснага ў гэтай даступна напісанай і па-свойму арыгінальнай кніжцы маглі б знайсці для сябе вучні агульнаадукацыйных школ, якім катастрафічна не хапае цёпля дапаможнікаў па гісторыі роднага краю. Гэта добры даведнік і для тых, хто сабраўся ў падарожжа ці нават дзелавую камандзіроўку ў незнаёмы пакуль што райцэнтр. Але зноў жа — 10 тысяч... Тыраж даўно разышоўся, і цяпер шукай не шукай — не знойдзеш. Не ведаю, ці хапіла нават бібліятэкам. Наўрад ці.

А мо выдавецтва «Народная асвета», якое выпусціла «Нашы гарады», зможа выправіць сваю тыражную памылку? Кажуць, набор яшчэ «не рассыпалі». На маю думку, можна выпусціць і паўторным выданнем. Гэта лепш, чым бясконцыя дэтэктывы іншых выдаўцоў.

Ганна ЛАГУН.

ПУНКТ ПОГЛЯДУ

Прыкрываючыся імем народа, нас зноў цягнуць у імперыю

695 ВЫКЛАДЧЫКАЎ, СУПРАЦОЎНІКАЎ І СТУДЭНТАЎ ВІЦЕБСКАГА ПЕДАГАГІЧНАГА ІНСТЫТУТА ДАЗВОЛІЛІ САБЕ ВЫСТУПІЦЬ АД ІМЯ ЎСІХ БЕЛАРУСАЎ

Прынамсі, так можна меркаваць па допісе ў газеце «Праўда» за 1 снежня г. г., з якім выступілі віцебскія сябіты «разумнага, добрага, вечнага».

Гэтае выступленне звернута да прэзідэнта Расіі Б. Ельцына. Што ж хвалюе нашых землякоў, што падштурхнула іх выйсці на самога кіраўніка суседняй вялікай дзяржавы, у тым ліку і ад нашага з табой, чытач, імя?

Як я зразумеў, плач гэтых віцяблян па «разрушении единого государства, которое произошло вопреки воле абсолютного большинства граждан нашей страны», па «политике сознательного геноцида, проводимого в отношении великороссов, малороссов (звярніце ўвагу на адмысловую тэрміналогію. — Г. Д.), белорусов и других народов, населяющих Россию», па «продаже интересов России», па тым, каб «не издеваться над русским языком», бо «Россия же всегда была великим, единым и неделимым государством» і г. д., і г. д.

Думаю, кожнаму чытачу ўжо добра бачна, з якой катэгорыяй людзей маем справу. Адпаведна, мы маем поўнае права сказаць: шаноўныя, няхай у вас будзе свая думка наконт падзей у свеце, у тым ліку і ў Расіі, але, калі ласка, не далучайце нас усіх да свайго такога пячорнага погляду і да сваёй нетактоўнасці ў адносінах да ўсенародна выбранага прэзідэнта Расіі!

Выбачайце, шаноўныя плакальшчыкі з Віцебска, але нават адзін з самых вялікіх фальсіфікатараў гісторыі Беларусі Абэцэдарскі не дазваляў сабе нават у часы сталінізму такіх невуцкіх і зневажальных абраз, якія дапускаеце вы, людзі з прэтэнзіяй на высокую адукацыю і культуру ды на гуманізм: «Мы, белорусы, исконно имперский народ, лишились Родины — Великой России».

Калі б усё гэта вышэйзгаданае напісалі толькі студэнты, было б яшчэ зразумела: лайдакі і недавучкі, не чыталі ні летапісаў, ні кніг па гісторыі В. Ластоўскага, У. Ігнатоўскага і М. Ермаловіча, самае большае — задавальняліся адфільтраваным і сылганым падручнікам таго ж Абэцэдарскага. Але ж, згодна з праўдзінскай заметкай, тэкст гэты падпісалі (хутчэй за ўсё падрыхтавалі) і выкладчыкі, якія, безумоўна, лічаць сябе вучонымі мужамі высокага рангу, а то і аракуламі ісціны.

Не можа не кінуцца адразу ж у вочы: навука, ісціна тут адыходзяць на другі ці трэці план, бо заявы тыпу «мы, белорусы, исконно имперский народ», антынавуковыя. На першы ж план тут высоўваюцца асабістыя амбіцыі і палітычная кан'юнктура.

Асабіста я ўжо абнародаваў сваю думку пра тое «присоединение» (тагачасны афіцыйны тэрмін), падкрэсліваў, што яно, магчыма, выратавала нашых продкаў ад паланізацыі, абагаціла рускай культурай. Але сёння мы не можам глядзець на тое толькі праз ружовыя акуляры альбо заплюшчваць вочы на горкую ісціну: царскі ўрад прыклаў нямала намаганняў і насілля, каб «исконность» і «имперскость» беларускіх зямель як сваіх зрабіць з тэзіса фактам.

Не паяжуйцеся, шаноўныя, пагартайце хоць чатырохтомны зборнік дакументаў і матэрыялаў «Белоруссия в эпоху феодализма» (Мн., «Наука и техника», 1959—1979), нават там вы знойдзеце шмат доказаў таго, што ў высокіх кабінетах царскага ўрада была тайна распрацавана вялікая сістэма мер па русіфікацыі нашага краю. Усё было дбайна прадумана і ўлічана: і па ўзмацненню праваслаўя і папоў, навучаных у Расіі, і па рускіх вяльможах (ашчаслівілі нас найперш Траякуравымі ды тымі, хто вызначыўся пры задушэнні польскіх паўстанняў, раздачы беларускіх маёнткаў, у якіх бралі ўдзел і нашы землякі), і па ўкараненню чыноўнікаў, арандатараў з цэнтральных губерняў Расіі ды «с представлением им некоторых выгод», і па выжыванню з усіх сфер беларускай мовы, і па абрусенні беларускіх прозвішчаў ды па замене існуючых тут сваёй сістэмай мер, свят і звычаяў, а ўрэшце—па забароне ўжывання тэрміна «Беларусь». Нават было ўлічана і такое: «Награждение знаками отличия белорусских помещиков, наиболее преданных России. Однако ж сему начальству действовать притом с крайнею осторожностью, дабы не открыть цели правительства».

Калі мець на ўвазе, што беларусы за XIX стагоддзе былі гвалтам змешчаны ў страўнік Расійскай імперыі і прымусова там ператраўляліся, абязлічваліся як нацыя, то ў гэтым сэнсе мы — «имперские». Але пра «исконность» не варта ўводзіць у зман, бо яшчэ Дунін-Марцінкевіч ды Багушэвіч у тым жа XIX стагоддзі зразумелі, што тут і да чаго, заклікалі ўстоять і прадоўжыць слаўныя справы продкаў, аднавіць беларускую дзяржаўнасць (помніце, нават Ленін у адносінах да Беларусі ўжываў тэрмін «узнаўленне»!).

Гэтыя віцябляне ні слоўца не гавораць пра нацыянальнае адраджэнне беларускага народа і пра тое, у якіх умовах яно можа адбыцца — ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту, ва ўмовах нармальнага развіцця яе мовы і культуры. Больш — на маю думку, яны падаюць справу так, што ніякай беларушчыны не было і не павінна быць, а гэтым самым яны свядома ці несвядома за прадаўжэнне генацыду. Якія ж гэта Беларусь, беларусы без беларускага?!

Верагодна, з 695 прыхільнікаў «имперскости» нямала і тых, якія як вышэйшы духоўны ўзровень прапаведуюць тэзіс «Я — белорус, но белорусского не люблю». Гэты люд —наша бяда, наш боль. Многае ў нас усё лепш рабілася б пагаспадарску, трывала, на вякі, каб не іхняя абыякавасць да нашай памяці, да нашай гісторыі і культуры, да нашай зямлі, да нашай мовы. Верагодна, з гэтых 695 ёсць і тыя, радзіма якіх Расія, родная мова руская, якія прыехалі сюды «с высшей миссией», а некаторыя і па лусту з таўсцейшым слоем масла. Якая тут спагада да беларускіх слёз, якая міласць, падтрымка адной са старажытных славянскіх моў! «Имперскость» — вышэй за ўсё, асляпляе розум, раз'ядае душу і глуміць высакародныя пачуцці, а ўсё гэта не можа не нараджаць непаразуменні і канфлікты. Які ж ты мне сусед і сябар, калі засмечваеш мой калодзеж, кладзеш ногі на мой стол і плюеш у крыніцу нашай душы — на мову і культуру, цэлішся накінуць на мяне пятлю як на свайго парабка?! Не, зусім інакш трэба ладзіць адносіны, на грунце ўзаемапавагі і ўзаемападтрымкі, так, як умелі і ўмеюць нашы народы.

Генрых ДАЛІДОВІЧ.

БЕЛАРУСІК.
Фота Сяргея ПАНІЗНІКА.

ЧЫТАЧ АДГУКНУЎСЯ ВЕРШАМ

ЯЗЫК І МОВА

БАЙКА

Жылі-былі язык і мова.
Сугучча іхняе не нова.
І ўсё ж...
Аднойчы дрэйфу даў язык.
На мову стаў глядзець ён
падазрона.
«Ты што надумала!—сарваўся
ў крык.—
Мяне аддаць ты хочаш забароне?
Чаму адводзіш мне другое слова?»
Збянтэжана ўздрыгнула тут мова:
«Ды што ты, сябар, не грашы.
Жывеш ты ў людскім фаворы.
І толькі я—на дне душы,
Што азавецца ў сне ці ў горы...»
Але язык сярдзіта націскае:
«Тады чаму ж ты, мова, замінаеш?
Сядзела б у душы, як цвік
іржавы.
А то імкнешся важна да
дзяржавы».
«Няўжо ж дзяржаву твораць
без душы?—
Падняла мова сціпла вочы. —
Ці ты адзін такі ахвочы?»
Язык — сваё вядзе, хоць рэж:
«Лапцёўна ты, і ёй памрэш.
Ідзі ўжо... да завалінкі ў сяле,
Пакуль не адаслаў яшчэ далей».
На гэта—змоўкла наша
папялушка.
Стаіць падбітай хворай птушкай...
Тут самы час казаць мараль:
Прыйшоў к нам госць
І—правіць баль.

Іван СВЯТЛІЦКІ,
дацэнт Мінскага педінстытута.

Таямніцы каштоўных камянёў

Старадаўняя персідская легенда сцвярджае, што «каштоўныя камені — тварэнне д'ябла», які надаў ім чароўнае хараство, каб выклікаць у слабых людскіх душах прагнасць і ўсялякія спакусы.

Звычайна выбар каштоўнага каменя залежаў не толькі ад павеваў моды або асабістага густу чалавека. Камень служыў не толькі ўпрыгожаннем, — ён мог быць адзнакай прыналежнасці да пэўнай прафесіі, выконваць ролю талісмана, што падтрымлівае душэўную раўнавагу, або ахоўваць чалавека, які ім валодае, ад бяды і хваробы.

Астролагі лічаць, што сапраўдным талісманам могуць быць толькі камені, якія падораны чалавекам, што любіць вас, або якія вы атрымалі ў спадчыну. Камень, які вы купілі, стане «вашым» не адразу, а праз год ці нават дзесяцігоддзі. Есць камені, якія не прызначаны для таго, каб іх насілі пастаянна. Большасць каштоўных камянёў патрабуе аправы з пэўнага металу — толькі з золата, або срэбра, або медзі. Пярсцёнкі з каштоўнымі і паўкаштоўнымі камянямі, якія носяць на не адпавядаючым ім пальцы або не на той руцэ, могуць увогуле не правіць свайго добрага ўплыву на ўладальніка (а ў некаторых выпадках наогул уздзейнічаюць негатыўна).

Агат. Кажуць, што чорны агат ахоўвае ад небяспекі, дае свайму ўладальніку дабрыню, мяккасць і ўнутраную ўпэўненасць. Дваістасць чалавечай натуры кампенсуецца, калі насіць агат на левай руцэ. Агат — адзін з тых рэдкіх каштоўных камянёў, якія дазвалялася насіць у жалобе.

Аквамарын. Камень, які ўмацоўвае слабы дух чалавека. Людзям няшчырым насіць яго нават небяспечна — любая іх мана будзе выкрыта. Лічыцца, што аквамарын умацоўвае шчасце сямейнага жыцця, а таксама валодае лекавымі ўласцівасцямі — супакойвае зубны боль, палягчае страўнікавыя і пячоначныя колікі.

Дыямент (алмаз, брыльянт). Камень цудоўны і... страшны. Шчасце ён прыносіць толькі тады, калі атрыманы ў падарунак ці ў спадчыну. Гэта першы камень Задыяка, дзе сканцэнтраваны асаблівыя энергіі (таму ён далёка не ўсім падыходзіць). «Працаваць» такі камень пачынае далёка не адразу — не раней чым праз 7—9 гадоў пасля таго, як падарылі (а да гэтага можа ўздзейнічаць нават негатыўна). У якасці талісмана дыямент рэкамендуецца насіць на шыі (або левай руцэ), пры гэтым лепш, каб камень дакранаўся да скуры.

Аметыст. Камень «міру і раўнавагі». Насіць яго прапануецца ў аправе са срэбра (на безыменным пальцы вашай шчаслівай рукі). Кажуць, што гэта дапамагае выправіць недахопы вашай палавіны. Яшчэ аметыст называюць «каменем вандроўнікаў» — дзённае змяненне афарбоўкі каменя прадказвае непагадзь (буру на моры). Калі насіць гэты камень (але не ўвесь час), можна пазбавіцца дрэнных думак, сніць добрыя сны.

Александрыт. Лічыцца «цяжкім» каменем, бо здольны ўздзейнічаць на эмацыянальны стан чалавека. Александрыт указвае на будучыню, змяняючы свой колер (на некаторых руках колер змяняецца вельмі хутка). Такі камень могуць насіць толькі вельмі моцныя людзі, якія здольны вытрымаць любыя жыццёвыя выпрабаванні (пасля чаго іх чакае ўдача). З александрытам добра спалучаюцца людзі знакаў стыхіі Агню, паколькі гэта «рызыкоўныя» натуры, якія ўвесь час шукаюць выпрабаванняў.

Біруза. «Небяспечны» камень. «Маладая» — светлая біруза падыходзіць толькі натурам актыўным, «рызыкоўным» (але рызыкуючым толькі сабой). Для людзей па характару баязлівых яна не падыходзіць. «Сталую»— блакітную бірузу людзі звязваюць з уладай, справядлівасцю, аўтарытэтам. Гэта «камень адважных», здольных павесці за сабой іншых на барацьбу са злом. Яна карысная ў справах сардэчных, заўсёды была папулярным амулетам дзяўчат і маладых жанчын. Зялёная («мёртвая») біруза падыдзе толькі для людзей упэўненых у сабе, якія ўжо дасягнулі жыццёвай мэты, і насіць яе трэба пасля 64 гадоў. Біруза, якая аздоблена срэбрам, — лекавы сродак супраць бяссонніцы і кашмараў. Гавораць, што «жывая» біруза дорыць мір у сям'і, прыносіць шчасце ўсім, хто захоўвае маральныя нормы. А на людзей злосных і языкастых біруза ўздзейнічае негатыўна.

ВАША ЗДАРОЎЕ

Не толькі алкаголь пагражае печані

Тыя, хто думае, што праблемы з печанню могуць мець толькі алкаголікі, — глыбока памыляюцца. На сённяшні дзень вядома каля 100 розных тыпаў захворванняў гэтага далікатнага органа, сярод якіх — жаўтуха і рак печані.

З півам і гарэлкай многія з гэтых хвароб маюць мала агульнага. На жаль, печань лёгка паддаецца хваробам, але не адчувальная да болю. Таму яе пашкоджанне заўважаецца часта тады, калі ўжо вельмі позна. У сувязі з гэтым раім звярнуць увагу на прычыны хвароб печані.

Самавольнае і празмернае ўжыванне таблетак можа аказацца апрытай для печані.

Лекі, якія ўжываюцца без рэкамендацыі ўрача, хутчэй за ўсё будуць адмоўна ўплываць на гэты орган і часта з'яўляюцца прычынай цяжкіх хвароб.

Таму пераканайцеся, ці лекі, якія вы ўжываеце, такія неабходныя і ці нельга ад іх адмовіцца. Калі сумняваецеся, звярніцеся да ўрача.

Празмернае і тлустае харчаванне моцна абцяжарвае печань. Пры гэтым яна не спраўляецца з выманнем сваіх функцый і можа падвергнуцца пашкоджанню. Дайце ёй адпачыць.

Нармальную работу гэтага органа забяспечыць умеранае разнастайнае харчаванне.

Максімальную асцярожнасць трэба захоўваць пры карыстанні аэразолямі.

Усе хімікаты і іншыя шкодныя рэчывы, якія пранікаюць у арганізм праз органы дыхання, мусяць быць нейтралізаваны печанню. Таму пасля ўжывання аэразоляў для ўкладкі валасоў, іх фарбавання ці знішчэння насякомых неабходна заўсёды праветрыць памяшканне.

ДАЎРАЧЭБНАЯ ДАПАМОГА

Парушэнні сну

Праяўляюцца бяссонніцай, хаджэннем у час сну, санлівасцю і начнымі страхамі.

Звычайная санлівасць чалавека — вынік стомленасці, недасыпання. Яна развіваецца пасля чэрапна-мазгавых траўм і сведчыць аб іх цяжкасці. Санлівасць узнікае яшчэ пры запаленні мазгоў (энцэфалітах, асабліва эпідэмічным), атручэннях снатворнымі, пухлінах і іншых пашкоджаннях галаўнога мозгу, істэрыі. Паталагічная санлівасць цягнецца ад некалькіх гадзін да некалькіх дзён і нават тыдняў, а пры некаторых псіхічных захворваннях (старэчай прыдуркаватасці, ідыятыі і інш.) — месяцы.

Найбольш часта сустракаюцца вострыя прыступы непераадольнай санлівасці. Нярэдка яны ўзнікаюць днём у час яды, язды ў транспарце, работы. Сон кароткачасовы і павярхоўны. Хворы застаецца ў той позе, у якой штосьці выконваў, а пасля абуджэння працягвае пачатую справу. Часта прыступы дзённых засыпанняў спалучаюцца з перыядамі слабасці і нейкай нерухомасці. Асабліва пасля абуджэння і перад засыпаннем. Часта бываюць галюцынацыі і сны. Такія прыступы звычайна

назіраюцца ў людзей, якія пакутуюць атлусценнем, павышаным крывяным ціскам. Іншы раз з узростам прыступы спыняюцца.

Перыядычная спячка таксама праяўляецца раптоўнымі прыступамі непераадольнай санлівасці, аднак яны больш працяглыя. Хворы прачынаецца толькі для прыёму яды. Разбудзіць такога хворага вельмі цяжка.

У юнакоў у перыяд палавога паспявання і пасля яго іншы раз адзначаюцца вострыя прыступы санлівасці, якія цягнуцца ад некалькіх гадзін да некалькіх сутак, спалучаюцца з прыкметамі псіхапатыі, а іншы раз — з абжорствам і празмернай смагай.

Прыступ санлівасці іншы раз развіваецца ў час прыступу мігрэні, паніжэння ўзроўню глюкозы ў крыві, пры нырковай недастатковасці.

Нярэдка павышаная санлівасць праяўляецца летаргіяй — «уяўнай смерцю», якая ляжыць ад некалькіх гадзін да некалькіх гадоў. Пры гэтым расстройстве сну дыханне цяжка выявіць, зрэнкі на святло не рэагуюць, скура халодная і бледная. Заснулы не рэагуе на боль, у яго рэзка паніжаны крывяны ціск. На працягу некалькіх дзён ён не есць і не п'е, худзее, абязводжваецца. Кал і мача не выдзяляюцца, зрэдку азначаецца амаль непрыкметны рух век. Для жыцця летаргія не ўяўляе небяспекі.

Начныя страшныя сны бываюць у неўратычных дзяцей, а таксама ў дарослых людзей у перыяд белай гарачкі, пячоначнай, нырковай і сардэчнай недастатковасці, эпілепсіі, дэпрэсіі. Прачнуўшыся, яны крычаць, плачуць, баяцца цемры. Раніцай нярэдка не памятаюць аб такіх з'явах. Прыступы страху нярэдка паўтараюцца.

АКАЗАННЕ ДАПАМОГІ

Пры летаргіі неабходна захоўваць спакой, цішыню ля пасцелі хворага, якому патрэбны свежае паветра і багатая вітамінамі яда. Абавязкова выклікаць неўрапатолага.

Калі павышаная санлівасць у чалавека з вялікай масай цела, патрэбны разгрузачныя дні. У меню трэба ўключыць прадукты, якія ўтрымліваюць калій (курагу, урук, буракі, печаную бульбу, разынкі), абмежаваць прыём кухоннай солі. Тым, хто пакутуе неўрозам, карысныя самаўнушэнне, водныя працэдуры. Ім трэба абследавацца ў неўрапатолага.

У выпадку з'яўлення начных страхаў трэба неадкладна наведаць неўрапатолага. А дома стварыць абстаноўку спакою, добразычлівасці. Перад сном праветрыць пакой. Хвораму карысна ўдыхаць настойку валяр'яны з флакона.

Таццяна ФАМІНА,
кандыдат медыцынскіх навук.
г. Мінск.

РОЗГАЛАС

ЯШЧЭ АДНА ЛЕВАЯ ПАРТЫЯ

На палітычным небасхіле краіны неўзабаве, відаць, з'явіцца яшчэ адна партыя, якую арганізатары мяркуюць назваць Партыяй сацыяльнай справядлівасці.

Праграмныя мэты ПСС у многім паўтараюць дэкларацыі іншых, ужо існуючых беларускіх партый левага і цэнтрысцкага кірунку. Так, Партыя сацыяльнай справядлівасці выступае за захаванне на цяперашнім этапе планавай эканомікі «з элементамі свабоднага рынку», дзяржаўнай уласнасці на буйную прамысловасць, прыродныя рэсурсы і камунікацыі, калектыўную ўласнасць на большую частку зямлі. На думку арганізатараў ПСС, сацыяльныя гарантыі павінны па-ранейшаму цалкам заставацца абавязкам дзяржавы.

Пра адносіны да нацыянальнага адраджэння Беларусі ў звароце аргкамітэта новай партыі, напісаным на рускай мове, не гаворыцца. Згадваецца, аднак, што ПСС будзе выступаць за ўмацаванне суверэнітэту рэспублікі, супраць праяў нацыяналізму і экстрэмізму ў палітыцы.

Ля вытокаў новай партыі стаяць народныя дэпутаты Беларусі В. Іваноў, А. Нятылькін, В. Шарко, а таксама П. Шацько, які пазначаны ў спісе як «народны дэпутат СССР».

Па меры набліжэння да парламенцкіх выбараў колькасць палітычных партый, якая ўжо і так перасягнула за дзесятак, відавочна, яшчэ больш узрасце. Выбаршчыкам трэба рыхтавацца да таго, што зарыентавацца ў гэтым парадзе праграм будзе надзвычай няпроста.

Валянцін ЖДАНКО.

«Палітычны дуэт — С. Шушкевіч і В. Кебіч — з'яўляецца для Беларусі гарантам стабільнасці ў цяперашніх умовах»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

— Па-першае, трэба яшчэ дачакацца рашэння парламента. Па-другое, мне здаецца, што ў В. Кебіча ў гэтым проста няма неабходнасці. І, патрэцяе, — яшчэ няма рашэння аб прэзідэнцтве ў РБ. І наогул, наўрад ці абодва лідэры адкрыта ўключацца ў барацьбу за пасаду Прэзідэнта. Яны дастаткова сталыя, разумныя людзі, здольныя ўсё ўзгадніць. Яны ж, напэўна, разумеюць, што, калі адначасова выставяць свае кандыдатуры на ролю кіраўніка дзяржавы, выбары могуць не адбыцца, паколькі ў абодвух лідэраў дастаткова прыхільнікаў. Да таго ж, узровень палітычнай актыўнасці грамадзян цяпер невысокі. Напрыклад, у час аб'яўленых у мінулую нядзелю давыбараў у народныя дэпутаты рэспублікі па шэрагу акруг Беларусі максімальная яўка людзей на выбарчыя ўчасткі склала ўсяго 8—23 працэнты. Адным словам, многае будзе залежаць ад сістэмы выбараў прэзідэнта. Зразумела, калі парламент наогул пагодзіцца з увядзеннем гэтай пасады.

— А што, вы лічыце, можа і не пагадзіцца?

— Пакуль што цяжка сказаць нешта пэўнае. Існуюць розныя пункты гледжання. Няма адзінства па пытанню аб прэзідэнцтве і ў аб'яднанні «Беларусь». Разам з тым, як мне расказалі ўдзельнікі нядаўняга пасяджэння Канстытуцыйнай камісіі, С. Шушкевіч змякчыў сваю пазіцыю ў адносінах да ўвядзення ў рэспубліцы інстытута прэзідэнцкай улады, хоць раней кіраўнік парламента быў працўнікам яго неадкладнага зацвярджэння.

Многія лічаць, што, калі і будзе прэзідэнт, то ён не павінен быць кіраўніком выканаўчай улады.

— Вы таксама так лічыце?

— Насупраць. Думаю, што рэспубліка не мае патрэбы ў прэзідэнце, дзейнасць якога абмяжоўвалася б удзелам у пратакольных цырымоніях. Я — за прэзідэнта, які выконваў бы функцыі кіраўніка дзяржавы, узначальваў выканаўчую ўладу і нёс персанальную адказнасць за ўсё, што адбываецца ў рэспубліцы. Перакананы, настала неабходнасць ва ўмацаванні выканаўчай улады. Недасканаласць дзеючага заканадаўства, разбуральныя тэндэнцыі, а таксама многія іншыя фактары не дазваляюць кіраўніцтву рэспублікі аператыўна рэагаваць на змяненні сітуацыі ў эканоміцы і палітыцы. Ну, скажыце, ці можна, напрыклад, назваць нармальнай сітуацыю, калі Беларусь падпісвае дакумент аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве з краінай і ў той жа час не спяшаецца ўстанаўліваць з ёю дыпламатычныя адносіны?

Калі рашэнне аб увядзенні прэзідэнцтва будзе прынята, усё роўна працэс яго рэальнага зацвярджэння ў сістэме кіравання дзяржавай непазбежна зойме пэўны час. Таму я падтрымліваю прадастаўленне кіраўніку ўрада некаторых дадатковых паўнамоцтваў. Цяпер у Савеце Міністраў рыхтуецца праект адпаведнай пастановы парламента. Напрыклад, трэба прадаставіць магчымасць прэм'еру самастойна, без узгаднення з Вярхоўным Саветам займацца кадравымі перастаноўкамі ў саставе ўрада. Парламенту дастаткова зацвярджаць толькі міністраў замежных, унутраных спраў, абароны, юстыцыі, эканомікі і фінансаў. Складваецца ж сітуацыя, пры якой прэм'ер не ў стане без санкцыі Вярхоўнага Савета адхіліць міністраў, старшынь дзяржкамітэтаў ад работы, нават калі работа іх і іх ведамстваў нездавальняючая. Апрача таго, Старшыня Савета Міністраў павінен, на мой погляд, валодаць сур'ёзнымі паўнамоцтвамі ў крэдытна-фінансавай сферы.

— Генадзь Іванавіч! Беларусь лічыцца адной з самых стабільных сярод рэспублік СНД. Вы не лічыце, што ўвядзенне інстытута прэзідэнцкай улады можа негатыўна адбіцца на грамадска-палітычнай абстаноўцы?

— Спадзяюся, што гэтага не здарыцца. Ва ўсякім разе, дэпутацкае аб'яднанне «Беларусь» робіць усё магчымае для захавання стабільнасці ў нашай рэспубліцы праз стабільнасць у парламенце.

Сапраўды, існуюць сілы, якія імкнуцца пасеяць у Беларусі смуту, парушыць грамадска-палітычную абстаноўку. Зусім нядаўна, напрыклад, была запушчана, на мой погляд, зусім недарэчная «вутка» (а магчыма, правакацыйная?) аб тым, што нібыта аб'яднанне «Беларусь» займаецца зборам подпісаў дэпутатаў пад дакументам аб аб'яўленні імпічменту цяперашняму кіраўніку Вярхоўнага Савета. Афіцыяльна заяўляю: нічым падобным «Беларусь» не займаецца і нават размоў на гэту тэму ў нас ніколі не было. Наадварот, лічу, што палітычны дуэт — С. Шушкевіч і В. Кебіч — з'яўляецца для Беларусі гарантам стабільнасці ў цяперашніх умовах.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ

ПРАГРАМА ТЭЛЕПЕРАДАЧ

14 снежня, ПАНЯДЗЕЛАК

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

16.25. Прыродазнаўства. 2-гі клас.
16.40. «Горад майстроў». Мастацкі фільм.
18.00. Каралеўскае паляванне. Шоў-казіно.
19.00. Абласныя навіны (Брэст).
19.10. Кірмаш: кантакты і кантракты. Прымае ўдзел міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі В. В. Ватура.
19.45. «Вобраз». Літаратурны часопіс.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. Спартыўны тэлекур'ер.
21.50. Мастацкі фільм «Сад».
23.15. Рамансы і песні на вершы Якуба Коласа.
23.50. НІКа.

КАНАЛ «АСТАНКІНА»

17.00. Навіны.
17.25. Зорная гадзіна.
18.10. Футбольны агляд.
18.40. Ю. Паніч. «Дарога дамоў». «Што пасеешь...»
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «Дробязі жыцця». 11-я серыя «Візіцёры».
21.10. Бамонд.
21.25. Аднак.
21.35. Каталог Федэрыка.
21.55. Сітуацыя.
23.25. Джэм-сейшн. У перапынку (23.00) — Навіны.

КАНАЛ «РАСІЯ»

7.00. Вестні.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. «Загадка Сахаліна».
11.00. «Ха-Бі-асы».
12.20. Рэпарцёр.
12.35. Гандлёвы дом «Т. Ін. Ка.».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Вестні.
15.00 Тэлебіржа.
15.30. Сям'я Смірновых: як жыць далей?» Тэлефільм (Аўстрыя).
16.15. Там-там навіны.
16.30. «Еўропа — Азія».
17.20. Панове-таварышы.
17.35. Настальгічныя вячоркі.
18.05. Пігмаліён.
18.35. Мульці-пульці.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Вестні.
19.25. «Штэмп». Мастацкі фільм.
20.50. Крымінальны паведамленні.
21.00. Без рэтушы.
22.25. Спартыўная карусель.
22.40. Сёння ў ВС Расіі.
22.55. Фільм-балет на музыку Р. Шчадрына.

15 снежня, АЎТОРАК

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.30. Раніца рэспублікі.
9.00. Прыродазнаўства. 2-гі клас.
9.15. «Рыцары неба». Мастацкі фільм 10-я серыя.
9.45. Фільм-канцэрт.
16.30. Музыка і спевы. 3-ці клас.
16.50. «Бабульчыны ўрокі», «Цуды тэхнікі», «Ярлык і гульталі», «Казка пра карасёў, зайцоў і абаранкі», «Курица загаварыўся». Мультфільмы.
17.40. Тэлеклуб «Пошук».
18.00. Дак. фільмы.
19.00. Абласныя навіны (Віцебск).
19.10. «Пяць зорак». Тэлегульня.
20.00. «Пудзіла». Мультфільм для дарослых.
20.10. Мост.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. Тэлебіржа.
21.40. «Рыцары неба». Мастацкі фільм 12-я серыя.
22.10. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — НІКа: «Багдадскі злодзей» (Англія).

КАНАЛ «АСТАНКІНА»

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. «Імперыя». Мастацкі фільм (Канада). 1-я серыя.
9.10. Футбольны агляд.
9.40. Новыя імёны.
10.25. «Дробязі жыцця». 11-я серыя «Візіцёры»
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Ігар Сававіч». Мастацкі фільм. 1-я серыя «Бліскучы Ігар Сававіч».
12.25. «Царэўна-жаба». Мультфільм.
12.55. «Чужы». Мастацкі фільм.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Дзелавы веснік.
14.40. Блакнот.
14.45. Р. Шчадрын. Музыка да балета «Дама с собачкам».
15.15. «Пчала Мая».
16.05. Наш музычны клуб.
16.45. Прэс-экспрэс.
17.00. Навіны.
17.25. Міждзяржаўны тэлеканал «Астанкіна» прадстаўляе.
18.00. «Вяртанне ў Эдэм» (Аўстралія). 1-я серыя.
18.50. Мініяцюра.
19.00. Тэма.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «Армавір». Мастацкі фільм
23.00. Навіны.
23.20. Ваеннае рэвю.
23.50. «Імперыя» 1-я серыя.

КАНАЛ «РАСІЯ»

7.00. Вестні.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. «Снег — лёс мой». (Нарыльск. Гады. Людзі). Дак. фільм. 2-я серыя.
11.00. «Кукарача». Мастацкі фільм.
12.35. Гандлёвы дом «Т. Ін. Ка.».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Вестні.
15.00. Тэлебіржа.
15.30. Студыя «Рост».
16.00. Там-там навіны.
16.15. Панарама прыватызацыі.
17.00. «Цела — храм душы».
17.30. Парламенцкі веснік.
17.45. Альбуцыд.
18.35. Мульці-пульці.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Вестні.
19.25. «Санта-Барбара».
20.15. А. Шагінян пра Віктара Некрасава і Аляксандра Галіча.
21.00. На палітычным Алімпе.
22.00. Вестні.
22.25. Спартыўная карусель.
22.40. Сёння ў ВС Расіі.
22.55. Д. Расіні на сцэне «Новай оперы».
23.15. Арт-абстрэл.

16 снежня, СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. Кінанарыс.
9.00. Музыка і спевы. 3-ці клас
9.20. «Рыцары неба». Мастацкі фільм. 11-я серыя.
9.50. «Крумкач». Кінанарыс.
10.00. «Дзе ты быў, Адысей?». 1-я серыя.
16.30. Д. Урбан. «Усе мышы любяць сыр». Спектакль для дзяцей.
17.40. Мультфільм.
18.00. Беларуская паэзія ў творчасці кампазітара У. Будніка.
19.00. Фестываль новай беларускай музыкі 1-е аддзяленне.
20.15. «Пра бурага мядзведзя». Дак. фільм.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. «Рыцары неба». Мастацкі фільм. 13-я серыя.
22.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — НІКа: Фестываль новай беларускай музыкі.

КАНАЛ «АСТАНКІНА»

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. «Імперыя». 2-я серыя.
9.10. Наш музычны клуб
10.10. Канцэрт.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Ігар Сававіч». Мастацкі фільм. 2-я серыя.
12.30. Мультфільм.
12.55. «Родныя стэпы». Мастацкі фільм.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Тэлемікст.
15.10. Блакнот.
15.15. «Пчала Мая».
16.05. «Пяючае Кураная». Дзіцячая праграма з Казахстана.
16.50. Прэс-экспрэс.
17.00. Навіны.
17.20. Тэленарыс.
17.40. Выступленне прэзідэнта Рэспублікі Казахстан Н. А. Назарбаева.
18.05. «Вяртанне ў Эдэм». 2-я серыя.
18.55. Канцэрт.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «Дакрананне». Мастацкі фільм.
22.00. Урмас От гутарыць з Міхаілам Гарбачовым.
23.00. Навіны.
23.25. Магчыма ўсё.
23.55. «Імперыя». 2-я серыя.

КАНАЛ «РАСІЯ»

7.00. Вестні.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. Германія ўніверсітэцкая.
11.00. «Санта-Барбара».
11.50. «Туманган».
12.35. Гандлёвы дом «Т. Ін. Ка.».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Вестні.
15.00. Бізнес: новыя імёны.
15.15. «Бадабоні».
15.40. Вольны час.
15.55. Там-там навіны.
16.10. Далёкі Усход.
16.55. Давайце разбяромся.
17.10. Хрысціянская праграма.
17.40. «Снег — лёс мой» (Нарыльск. Гады. Людзі). 3-я серыя.
18.35. Мульці-пульці.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Вестні.
19.25. «Санта-Барбара».
20.15. Кнот-відза. «Кароль».
20.50. Крымінальныя паведамленні.
21.00. Тэлебюро расследаванняў.
22.00. Вестні.
22.25. Спартыўная карусель.
22.40. На сесіі ВС Расіі.
23.10. Цішыня № 9.

17 снежня, ЧАЦВЕР

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Рыцары неба». 12-я серыя.
9.15. «Знахар». Дак фільм.
9.35. «Дзе ты быў, Адысей?». 2-я і 3-я серыі.
16.30. Гісторыя Беларусі. 11-ы клас
17.00. Мультфільм.
17.15. Вадзім Гацко — пераможца Рэспубліканскага конкурсу юных піяністаў.
18.00. Нязгаснае «Полымя». Да 70-годдзя часопіса.
18.40. «Пасля фінішу». Дак. фільм.
19.00. Абласныя навіны (Гродна).
19.10. Зачытайце маё пісьмо...
19.15. Дыялог амерыканскіх бізнесменаў.
19.45. «Адданасць». Супрацоўніцтва. Стараннасць — дэвіз акцыянернага таварыства швейнай фірмы «Мілавіца».
20.20. Тыдзень беларускага ўрада.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. «Рыцары неба». 14-я серыя.
22.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — НІКа: «Беларуская музычная восень».

КАНАЛ «АСТАНКІНА»

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. «Кідзі-відзі».
8.35. «Імперыя». Мастацкі фільм. 3-я серыя.
9.25. Тэатральныя сустрэчы.
10.05. «Айбаліт і Вармалей». Мультфільм.
10.20. «Агідаль-92».
11.00. Навіны.
11.20. «Ігар Сававіч». 3-я серыя.
12.30. Мультфільм.
12.50. «Безыменная зорка». Маст. фільм. 1-я серыя.
14.00. Навіны.
14.25. Тэлемікст.
15.10. Блакнот.
15.15. «Пчала Мая». Мультфільм.
16.05. ...Да 16 і старэйшым.
16.45. Прэс-экспрэс.
17.00. Навіны.
17.25. Хакей. Міжнародны турнір на прыз газеты «Известия». Зборная Расіі — зборная ЧСФР. У перапынку — Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Лато «Мільён».
21.10. Мастацкі фільм «Вярбоўшчык».
22.40. Што абазначаюць вашы імёны? У перапынку (23.00) — Навіны.
0.30. «Імперыя». Мастацкі фільм 3-я серыя.

КАНАЛ «РАСІЯ»

7.00. Вестні.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. Без рэтушы.
11.00. «Санта-Барбара».
11.50. Настальгічныя вячоркі.
12.20. Паралелі.
12.35. Гандлёвы дом «Т. Ін. Ка.».
12.40. Сялянскае пытанне
13.00. Вестні.
14.50. Тэрмінал.
15.20. Студыя «Рост».
15.50. Там-там навіны.
16.05. Тэлефільм (Аўстрыя).
16.50. Кіпрас Мажэйка. Рэпартажы з НАТО.
17.20. Парламенцкі веснік.
17.35. «Макбет» у пастаноўцы Н. Баярчыкава.
18.35. Антракт. Спявае Святлана Лазарава.
18.45. Свята кожны дзень
19.00. Вестні.
19.25. «Санта-Барбара».
20.15. У свеце аўта- і мотаспорту.
20.50. Спецыяльны камерцыйны веснік.
21.00. Ціхі дом.
22.00. Вестні.
22.25. Спартыўная карусель.
22.40. На сесіі ВС Расіі.
23.10. Ціхі дом (працяг).

18 снежня, ПЯТНІЦА

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. Кінанарыс.
9.00. Гісторыя Беларусі. 11-ы клас.
9.30. «Добраахвотнікі». Мастацкі фільм.
16.30. Мультфільмы.
17.25. «Слова Божае — ў нядзельнай школе».
18.00. Дакументальныя фільмы.
19.00. Абласныя навіны (Магілёў).
19.10. Палітычны калейдаскоп.
19.45. Студыя «Тэлесябрына».
20.10. «Слова».
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. Тэлебіржа.
21.40. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

КАНАЛ «АСТАНКІНА»

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. «Імперыя». 12-я серыя.
9.10. Клуб падарожнікаў.
9.50. «Пётр Багамазаў. Паміж стартам і фінішам».
10.30. Амерыка з М. Таратутам.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Ай лаў ю, Пятровіч!». Мастацкі фільм.
12.55. «Безыменная зорка». Мастацкі фільм. 2-я серыя.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Брыдж.
14.50. Бізнес-клас.
15.10. «Пчала Мая».
15.35. Цэнтр.
16.05. Канцэрт
16.45. Прэс-экспрэс.
17.00. Навіны.
17.25. «Галасы Радзімы».
17.50. Чалавек і закон.
18.15. Амерыка з М. Таратутам.
18.45. Поле цудаў.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Прэм'ера тэлевізійнага мастацкага фільма «Анёлы з калючкамі» (Венгрыя).
21.45. Палітбюро.
22.20. Музагляд.
23.00. Навіны.
23.20. Чалавек тыдня.
23.35. Хіт-канвеер.

КАНАЛ «РАСІЯ»

7.00. Вестні.
7.25. Час дзелавых людзей.
10.00. Лепшыя гульні НБА.
11.00. «Санта-Барбара».
11.50. Паралелі.
12.05. Кіпрас Мажэйка. Рэпартажы з НАТО.
12.35. Гандлёвы дом «Т. Ін. Ка.».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Вестні.
15.00. Тэлебіржа.
15.30. Студыя «Рост». «Тэатр зваяроў». Частка 2-я.
16.00. Там-там навіны.
16.15. «Сям'я Смірновых: як жыць далей?»
17.00. М-трэст.
17.15. Мегаполіс.
17.45. Уолт Дысней па пятніцах.
18.35. Мульці-пульці.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Вестні.
19.25. Мастацкі фільм «Панцыр», «Фрак народа».
21.45. Ваш прыватызацыйны чэк.
22.00. Вестні.
22.25. Спартыўная карусель.
22.40. На сесіі ВС Расіі.
23.10. «К-2» прадстаўляе: «Медыя».
23.50. «Лясы».

19 снежня, СУБОТА

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Расстанемся — пакуль добрыя». Мастацкі фільм 1-я серыя.
10.00. Паказвае Брэст.
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. «Снежны гарадок». Фільм-канцэрт.
11.40. Белыя і чорныя.
12.10. 20 мінут рэдактара.
12.30. «Эскізы да партрэта». Дак.фільм.
12.55. Чарнобыль: праблемы і вырашэнні. Прэс-канферэнцыя кіраўніцтва Дзяржкамчарнобыля Беларусі.
14.45. ПІК.
15.30. «Аб'ектыў — тэатр».
16.20. «За цудоўных дам!». Мастацкі фільм.
17.30. «Чыпаліна». Мультфільм.
18.10. Студэнты жартуюць... Гумарыстычная праграма.
19.25. «Фантазія». Фільм-канцэрт.
19.45. «Старонкі жорсткага былога». Мастацка-публіцыстычная праграма прысвечаная памяці рэпрэсіраваных пісьменнікаў.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. Тэлебіржа.
21.40. «Мапет-шоў». 1-я серыя.
22.05. «Форд». Дакументальны фільм.
22.50. «Сінема» прадстаўляе: мастацкі фільм «Замужам за мафіяй» (ЗША).
23.30. НІКа.
0.25. У стылі рэтра.

КАНАЛ «АСТАНКІНА»

6.00. Навіны.
6.20. Ранішняя гімнастыка.
6.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.30. Спорт-шанц: азартныя гульні.
8.00. «Марафон-15» — малышам.
8.25. Экалагічны агляд.
8.40. НЛА: неаб'яўлены візіт.
9.30. Аўтограф па суботах.
10.00. Справа.
10.10. Медыцына для цябе.
10.50. Мастацкі фільм «Клятва».
13.20. Студыя «Палітыка» прадстаўляе.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. «Дракуліта - вампіраня» (Францыя).
14.45. У свеце жывёл.
15.35. Тэлесерыял «АВВГД ЛТД». 9-я серыя.
16.05. Чырвоны квадрат.
16.45. Хакей. Зборная Канады — зборная Расіі. 2-гі і 3-ці перыяды.
18.25. Маст. фільм «Вярніся, Лумумба!».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Што? Дзе? Калі?
21.45. «Гардэмарыны эстрады». У перапынку (23.00) — Навіны.
23.30. Мастацкі фільм «Калыханка».

КАНАЛ «РАСІЯ»

7.00. Вестні.
7.30. Баскетбольны агляд НБА.
8.00. Свет спорту вачамі фірмы «Жылет».
8.30. Праграма «03».
9.00. Відэаканал «Плюс адзінаццаць».
10.15. «Як жыць будзем»?.
11.00. «Новыя казкі Шахеразады». 1-я серыя.
12.05. Мастак Ю. Міронаў.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Вестні.
13.20. Тэлеконкурс юрыстаў.
14.20. Пілігрым.
15.05. «Бурда модэн» прапануе...
15.35. Непазнаны Сусвет.
16.05. Футбол без граніц.
17.00. Залатая шпора.
17.30. Парламенцкі веснік.
17.45. Вуснамі дзіцяці.
18.15. Маскі-шоў.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Вестні.
19.20. Мульці-пульці. «Салавей».
19.30. «Руская песня» збірае сяброў.
21.00. Зусім сакрэтна.
22.00. Вестні.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Асарці.
23.00. Праграма «А».
23.30. Ад лібітум.
24.00. «Завяшчанне прафесара Доўэля». Мастацкі фільм.

20 снежня, НЯДЗЕЛЯ

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.30. Раніца рэспублікі.
8.40. Праграма перадач.
8.45. «Расстанемся — пакуль добрыя». Мастацкі фільм. 2-я серыя.
9.50. Урокі здароўя.
10.20. «Развітанне», «Джульета і іншыя».
11.10. Латарэя аўтографаў.
12.10. Мова, на якой «размаўляюць» ручнікі.
13.35. Х. Бойчаў. «Швейцарыя, Швейцарыя...». Спектакль.
15.35. Трагедыя вёскі Бабчын Хойніцкага раёна.
16.10. Пра шахматы і шахматыстаў.
16.40. «Спявае Юрый Антонаў».
17.05. Літаратурна - музычная кампазіцыя па вершах Е. Лось.
18.05. «Мапет-шоў». 2-я серыя.
18.31. Паміж намі, жанчынамі. Генная спадчына і наша будучыня.
19.30. Геракл. Культурызм — спорт для ўсіх.
20.00. Панарама.
20.40. Калыханка.
21.00. «Крок» прадстаўляе...
22.30. Каралеўскае паляванне. Шоу-казіно.
23.30. Студыя «Тэлесябрына». Эн-Ці-Ві на Беларусі. Сізбарток-20.
0.10. «Сінема» прадстаўляе: мастацкі фільм «Сто дзён у Палерма» (Францыя).

КАНАЛ «АСТАНКІНА»

6.00. Гадзіна сілы духу.
7.00. Тыраж «Спортлато».
7.15. «Чарцяня з пушыстым хвастом». Мультфільм.
7.30. «Залатыя россыпы». Перадача з Пярмі.
8.00. Дак. фільм.
8.30. Раным-рана.
9.00. «Пакуль усе дома». Забаўляльная праграма.
9.30. Ранішняя зорка.
10.20. Свет у вольны час.
11.00. «Прыгоды Чорнага Прыгакуна». 23-я серыя.
11.25. Новае пакаленне выбірае.
12.15. Народныя мелодыі.
12.30. «Піф і Геркулес».
12.40. «Падводная адысея каманды Кусто».
13.30. Служэнне муз не церпіць мітусні.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Дыялог у прамым эфіры.
15.00. Клуб падарожнікаў.
15.50. Жывое дрэва раместваў.
16.00. Панарама.
16.40. Тэлепоцыя.
16.55. Уолт Дысней прадстаўляе.
17.45. Навіны.
18.00. Прэм'ера рубрыкі: «Обана — вугал». Шоў.
18.50. Прэм'ера фільма-спектакля маскоўскага тэатра «Сучаснік» «Анфіса». П'еса Л. Андрэева.
20.55. Рэклама.
21.00. Вынікі.
21.45. Спартыўны ўік-энд.
22.00. Матадор.
23.00. Навіны.
23.25. Чэмпіянат Расіі па рукапашнаму бою.
24.00. «Баль двайнікоў».

КАНАЛ «РАСІЯ»

7.00. Вестні.
7.20. Мульці-пульці.
7.30. Дакументальная панарама «Ад першай асобы».
8.20. Праграма «Ключ»: «Нязвыклая 1812 года». Фільм 12-ы.
8.50. Наш сад.
9.20. «Прыгода ў каралеўстве», мультфільм.
9.50. Аты-баты...
10.20. Рэг-тайм.
10.50. «Новыя казкі Шахеразады». Мастацкі фільм. 2-я серыя.
11.55. «Сям'я Смірновых: Як жыць далей?»
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Вестні.
13.20. «Не высечы...». Вядучы — У Цветаў.
13.35. Паралельныя сусветы.
14.20. Мультфільм «Дараэман» (Японія). 15-я серыя.
14.35. Познер і Донах'ю.
15.05. Рэпарцёр.
15.20. Белая варона.
16.05. Кінакамедыя «Жыццё з бацькам».
18.10. Клуб «Жоўтая падводная лодка».
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Вестні.
19.20. Раман Карцаў і Віктар Ільчанка.
20.50. Прэзентацыя тыдня Сі-Бі-Эс на Расійскім тэлебачанні.
21.00. Момант ісціны.
22.00. Вестні.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Начны клуб Эс-Эн-Сі.

ЗАПРАГРАМУЙЦЕ СВАЁ ЗАЎТРА... Dainova Co Ltd

«ІНТЭКАМ»

РЭАЛІЗУЕ СА СКЛАДА Ў г. МІНСКУ

сухазараджаныя акумулятары

6СТ 75 — 24.500 руб. 6СТ 90 — 28.500 руб. 6СТ 132 — 40.000 руб.

Тэл. (0172) 78-84-26 факс (0172) 78-12-21.
Адрас: Мінск, вул. Казінца, д.105, корп. 2, пакой 219.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

11 снежня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Уральскі запаведнік». Кінанарыс.
9.00. Пазакласнае чытанне. 3-ці клас.
9.20. Кінанастальгія. «Мая вуліца».
16.30. Для школьнікаў. Ці любіце вы тэатр?
17.10. «Вострaў капітана». «Пакаці-гарошак», «Тры браты і зялёны дракон». Мультфільмы.
18.00. «Магія чорная і белая». Навукова-папулярны фільм.
18.30. «Галасы аднаго дрэва». Музычны фільм.
18.45. Абласныя навіны (Магілёў).
19.00. Алімпійскі баль. Свята ў гонар беларускіх спартсменаў. Трансляцыя з Мінскага палаца спорту.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. Тэлебіржа.
21.40. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — НІКа; Алімпійскі баль (працяг); Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі «Віцебск-92». Дзень другі.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. ...Да 16 і старэйшым.
9.10. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
10.00. Букет для Мікалая Озерана.
10.50. «Філя». Мультфільм.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Ход белай каралевы». Мастацкі фільм.
12.50. «Дзеці як дзеці». Мастацкі фільм.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Брыдж.
14.50. Бізнес-клас.
15.10. «Пчала Мая».
15.35. Тэніс. Кубак «Вялікага шлема».
16.10. Цэнтр.
16.50. Прэс-экспрэс.
17.00. Навіны.
17.25. Кожны пра сваё.
17.35. Чалавек і закон.
18.05. «Дом на Валконцы». Фільм 9-ы.
18.50. Поле цудаў.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.45. Мастацкі фільм «У палаце прыбою».
22.25. Від прадстаўляе: Палітбюро.
23.00. Навіны.
23.20. Музагляд.
24.00. Чалавек тыдня.
0.15. Аўташоў.
0.30. Зорны дождж.

Канал «Расія»

7.00. Вестні.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. Айчына мая.
8.50. «У старой песні доўгі век» (Мурманск).
9.15. Белая варона.
10.00. Лепшыя гульні НБА.
11.00. «Санта-Барбара».
11.50. «У цішыні маскоўскіх завулкаў». А. Васняцоў.
12.20. «Увага: здымаюць!»
12.35. Гандлёвы дом «Т. Ін. Ка».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Вестні.
15.00. Тэлебіржа.
15.30. Студыя «Рост». «15-гадовы капітан».
16.00. Там-там навіны.
16.15. Падраздзяленне асаблівай рызыкі.
16.45. Бізнес: новыя імёны.
17.00. М-трэст.
17.15. Непазнаны Сусвет.
17.45. «Чыпс — ваенны сабака». Мастацкі фільм. 2-я серыя.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Вестні.
19.25. «Бывай, Калумбі!» Мастацкі фільм (Англія).
20.45. Экран крымінальных паведамленняў.
20.55. Адыходзячая натура.
22.00. Вестні.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Вячэрні салон.

12 снежня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Тры гады». Мастацкі фільм. 1-я серыя.
9.50. «Куды дзьме вецер». Дак. фільм.
10.00. Паказвае Віцебск. Інфармацыйна-публіцыстычная праграма.
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Асілак. Прамая лінія.
12.05. 20 мінут рэдактара.
12.25. Дзівосны свет. Віялакацыя: містыка ці рэальнасць.
13.10. «Зачараваны вандроўнік». Мастацкі фільм.
14.55. Для дзяцей. Дарожная азбука.
15.25. Кітайская медыцына ў Мінску.
16.00. Водное поло. Кубак Чарнаморска-Балтыйскай лігі.
16.30. ПІК.
17.35. Цэнтр. Гістарычныя і сучасныя сувязі з Нямеччынай.
18.45. «Адраджэнне». Цыкл дакументальных фільмаў студыі «Летапіс». «Роздум ля палітры».
19.05. Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі «Віцебск-92». Дзень трэці.
20.05. «Не падзяліць жыццё і працу...» Праграма «Тры кіты» ў саўгасе-аграфірме «Стара-Барысаў».
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. Тэлебіржа.
21.45. «Сінема» прадстаўляе: мастацкі фільм «Следчы Фаяр па мянушцы Шэрыф» (Францыя).
23.35. НІКа.
23.50. Хто спявае «шуба-дуба»? Музычная праграма-жарт.
0.16. «Відзьма-нявідзьма». Навіны відэа-кіна-аўдыё.

Канал «Астанкіна»

6.00. Навіны.
6.20. Ранішняя гімнастыка.
6.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.30. Спорт-шанц.
8.00. «Марафон-15» — малышам.
8.25. Экалагічны агляд.
8.40. Дапамажы сабе сам.
9.10. Аўтограф па суботах.
9.40. Авіякасмічны салон.
9.55. Відавочнае — невераятнае.
10.25. Справа.
10.35. Музычны кіёск.
11.05. Фільм-спектакль Рускага драматычнага тэатра Беларусі «Хрыстос і Антыхрыст».
13.30. Праграма ЗША «Свабода выбару» з удзелам эканаміста М. Фрыдмана. Перадача 4-я «Паражэнне сацыялізму».
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Тэніс. Кубак «Вялікага шлема».
14.50. Мастацкі фільм «Стары Хатабыч».
16.20. Тэлесерыял «АВВГД ЛТД». 8-я серыя «Любоў і крэдыт».
16.50. Чырвоны квадрат.
17.30. Фільмы А. Мінадзе і В. Абдрашытава. «Слуга».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Што? Дзе? Калі?
21.45. «Аншлаг, аншлаг». Уладзімір Вінакур.
23.00. Навіны.
23.20. Тэніс. Кубак «Вялікага шлема». Паўфінал.

Канал «Расія»

7.00. Вестні.
7.25. Баскетбольны агляд НБА.
7.55. Азы кар'еры. «Па дарогах Германіі».
8.20. «ТВ-атальье».
8.25. Вінілавы джунглі.
9.00. Відэаканал «Плюс адзінаццаць».
10.15. Школа буйным планам.
11.00. «Кроні». Вядучы — прафесар Д. Балкагона?.
11.40. «Дараэман». 14-я серыя.
11.55. Меса Алега Янчаніі.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Вестні.
13.20. Кар'ера.
14.20. Пілігрым.
15.20. Казырная дама.
15.55. Футбол без граніц.
16.50. «К-2» прадстаўляе: «Абзац».
17.20. Парламенцкі веснік.
17.35. Вуснамі дзіцяці.
18.15. Джэнтльмен-шоў.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Вестні.
19.30. «Ха-бі-асы». Мастацкі фільм.
20.50. «Джэкпат». Мультфільм для дарослых.
21.00. Кантрасты.
21.40. Рэпарцёр.
22.00. Вестні.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Асарці.
23.00. Праграма «А».
23.30. Ад лібітум.
24.00. «Пані Марыя». Мастацкі фільм.

НА ДВОР'Е

11 снежня

Сёння ўдзень па рэспубліцы воблачнае надвор'е без істотных ападкаў, месцамі туман, галалёдзіца. Тэмпература паветра ў Гомелі мінус 1—3, Мінску, Магілёве — 0—мінус 2, Брэсце — каля 0, Віцебску — 0—плюс 2, Гродна — 1—3 градусы цяпла.

У наступныя двое сутак па рэспубліцы: удзень 12-га ў паўночна - заходняй палавіне, 13-га па большай частцы тэрыторыі ападкі, месцамі галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы — 0 — мінус 4, удзень — каля нуля.

Л. САНКЕВІЧ,
інжынер-сіноптык.

Калектыў выдавецтва «Беларускі Дом друку» смуткуе з прычыны смерці начальніка Рэспубліканскага піянерскага лагера «Зубраня» Мікалая Аляксандравіча ЖУКА і выказвае спачуванне яго родным і блізкім.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь,
калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЦІХАНОВІЧ, С. ШАУЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда».
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 32-51-05, аддзела пісьмаў — 32-04-52, 32-41-92, навін — 32-60-13, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91. Тэлефакс: 32-22-03.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.
Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Тыраж 81.098. Індэкс 63.850.
Зак. № 244
Выходзіць 250 разоў на год.
Нумар падпісаны ў 21.00.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 1.

МАДЭЛІРУЕМ АДЗЕННЕ

Гузік—дробязь, але...

Вы заўважылі, што, здавалася б, такі просценькі гузік пераўтварыўся ў апошнія гады ў «арыстакрата»! Ён цяпер можа з'явіцца і ў брошцы, і ў спражцы, і на штрыфелі пінжака, і заблішчэць у валасах заколкай... Зрэшты, гузікі заўсёды, акрамя свайго прамога прызначэння, служылі і дэкаратыўным элементам адзення. Іх выраблялі з самацветаў і высакародных металаў, слановай косці, чарапашага панцыра, перламутру і рэдкіх парод дрэва.

І сёння, як і раней, гузік у прамым і пераносным сэнсе ставіць «апошнюю кропку» ў касцюме. І, паверце, можа сапсаваць ураженне нават ад выдатна пашытай рэчы. Дык як жа выбраць патрэбны гузік? Тут важныя і велічыня, і памер, і адценне, і фактура паверхні.

Памер і форма гузіка залежаць ад характару рэчы— яе стылю і прызначэння. Выбраныя выпадкова, нават самыя эфектныя гузікі акажуцца «самі па сабе», і стыль касцюма будзе парушаны.

● Не варта для паўсядзённага адзення падбіраць бліскучыя металічныя гузікі.

● Калі вы невялікага росту, буйныя гузікі не падыдуць, а пры мажнай фігуры — не падыдуць дробныя.

● Да двухбортных паліто, жакетаў прымяняюцца плоскія гузікі з дзюма або чатырма адтулінамі.

● Гузікі з «ножкай» або «вушкам» падыходзяць для аднабортных вырабаў са шчыльных матэрыялаў з праразнымі або паветранымі петлямі. Такія ж (толькі дробныя) гузікі — для элегантных блузак, сукенак.

● Унікальныя гузікі, старадаўнія або сучасныя, могуць служыць упрыгажэннем, стаць аздобай у стужцы, разетцы,